УДК 81-2

***П. В. Кудрашоў,***
*курсант 1-га курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС*
*Навуковы кіраўнік: В. А. Лукіна,*
*дацэнт кафедры*
*сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# СТАН СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Тэрмін — фраза ці слова навуковай мовы, якія выкарыстоўваюцца для дакладнага ўжывання навуковых канцэпцый і абазначэння спецыяльных элементаў. Слова «тэрміналогія» мае два асноўныя значэнні: сістэма тэрмінаў адной галіны, а таксама сукупнасць усіх тэрмінаў пэўнай мовы. Термінологія — гэта штучна створаная сістэма моўных сродкаў, своеасаблівы лексічны пласт, кожная адзінка якога мае пэўныя абмежаванні ўжывання. Зыходзячы з гэтага, мы ўводзім азначэнне, што такое юрыдычная тэрміналогія: яна ўяўляе сабой спалучэнне сістэмы фраз і слоў, якія з'яўляюцца назвамі паняцця, якое выкарыстоўваецца ў юрыдычнай практыцы. У залежнасці ад выкарыстання прававой тэрміналогіі ёсць тры віды: агульныя, спецыяльна-прававыя і спецыяльна-неправавыя. Галоўная асаблівасць прававой тэрміналогіі — яе сістэмнасць, якая паказвае на розныя адносіны паміж тэрмінамі. Таксама адметнай асаблівасцю прававых тэрмінаў з'яўляецца санкцыянаванасць афіцыйнага адлюстравання ў законе.

У Рэспубліцы Беларусь пераклад юрыдычных тэрмінаў на беларускую мову адлюстраваны ў шматмоўным слоўніку прававых слоў, які быў распрацаваны ў Нацыянальным цэнтры прававой інфармацыі (НЦПІ). На сённяшні дзень слоўнік змяшчае больш за 12 тысяч юрыдычных тэрмінаў з перакладам на беларускую і англійскую мовы. Гэты слоўнік прадстаўлены ў структураванай форме і адлюстроўвае асацыятыўныя адносіны паміж словамі, яны таксама падтрымліваюцца нарматыўным азначэннем, індывідуальныя тэрміны маюць да 25 вызначэнняў з розных галін заканадаўства. Слоўнік прызначаны для навукоўцаў, адвакатаў, дзяржаўных органаў і ўсіх тых, хто зацікаўлены ў важнасці пэўных тэрмінаў у нарматыўных прававых актах. Слоўнік мяняецца і аднаўляецца, каб мець дачыненне да сучаснага беларускага заканадаўства з выкарыстаннем новых тэрмінаў, адаптаваных на сённяшні дзень.

З дадзенага слоўніка намі былі вылучаны словы, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца ў юрыдычнай лексіцы. Напрыклад, крымінальная: рабаванне —

ограбление, выканаўцы — исполнители, адказнасць — ответственность, грамадзянскі — гражданский, ажыццяўляецца — осуществляется, злачынства — преступления, згвалтаванне — изнасилование, непаўналетні — несовершеннолетний, гандаль — торговля, службовы — должностной, асоба — лицо, згодна — согласно, артыкул — статья, злоўжыванне — злоупотребление, прыцягнуты — привлечен, улада — власть. Для прыкладу і аналізу намі быў складзены тэкст, дзе ўжываюцца гэтыя словы:

У другім паўгоддзі бягучага года судовымі выканаўцамі Мінскай вобласці ажыццяўляўся кантроль за статыстыкай адміністрацыйных, грамадзянскіх, крымінальных і эканамічных справах у г. Барысаве. З 307 злачынстваў раскрытыя 189 [1]. Па характары злачынстваў пераважае згвалтаванне непаўналетніх, на другім месцы — гандаль наркотыкамі.

Акрамя таго, у Барысаве здзейснена 21 рабаванне і разбойны напад, 10 з іх раскрытыя. Таксама было падвергнута штрафу 46 службовых асоб, акрамя адной асобы,якая была прыцягнута да крымінальнай адказнасці згодна з арт. 424 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі) [1]. Падставай для прыцягнення да адказнасці паслужыла несвоечасовае пералічэнне аліментаў спагнанніку.

Такім чынам, беларуская юрыдычная тэрміналогія існуе і актыўна выкарыстоўваецца, аб чым сведчыць наяўнасць слоўніка, а таксама тэкстаў афіцыйна-справавой і перыядычнай тэматыкі.

1. Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] / Нац. цэнтр прававой і інфармацыі Рэсп. Беларусь. URL: http//belstat.gov.by/ (дата звароту: 01.05.2022). Перайти к источнику Вернуться к статье